Дзяржаўная ўстанова культуры
«Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# “Гучыць слова земляка над роднаю старонкаю”

Літаратурная спадчына Піншчыны



## Анатоль Шушко



*Я – голас пачуцця.*
*Я – колас сярод жыта.*
*Панадлівы прасцяг,*
*Няўрымслівае сіта.*

*А. Шушко*





**65-годдзю**
**з дня нараджэння**
**Анатоля Іванавіча Шушко**
**прысвячаецца…**

# Старонкі пражытага жыцця

Анатоль Іванавіч Шушко нарадзіўся 19 ліпеня 1954 года, як адзначана ў пасведчанні аб нараджэнні і пашпарце – у вёсцы Сташаны Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Аднак у сваёй біяграфіі паэт удакладняе: «На самай справе я нарадзіўся тым жа днём і тым жа годам, але ў мястэчку Чырвоная Слабада на Случчыне, дзе больш за месяц калыхаўся ў рэшаце-калысцы. А вось далейшае маленства і юнацтва, сапраўды, праходзілі ў Сташанах на Піншчыне».

*Маё маленства — настальгія*
*Аб незваротным, міражовым,*
*Дзе чутны, сёння дарагія,*
*Людскіх памкненняў перазовы.*
*Буслоў на ранку лёскат-клёкат,*
*Неўтаймаваны свіст шпачыны.*
*І тое мілае ДАЛЁКА,*
*Як ты імкнуўся быць мужчынам.*
*Таму, хоць лёс удалеч клікаў,*
*Больш распаляўся, як ні дзіўна,*
*Агмень маёй любві вялікай*
*Да юнае малой радзімы.*

*А. Шушко*

Сваімі першымі настаўнікамі лічыў маці Ганну Рыгораўну (Сякерыч), настаўніцу гісторыі і геаграфіі і бацьку Івана Канстанцінавіча Шушко. А цікавасць да літаратуры прывіў выкладчык славеснасці ў школе Мікола Купрэеў (1937–2004), вядомы пісьменнік. З дзяцінства сябраваў з земляком і паэтам Міколай Антаноўскім.

У 1971 годзе Анатоль Шушко паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля заканчэння ў 1976-м настаўнічаў на сваёй малой радзіме, у Ласіцкай сярэдняй школе на Піншчыне. Далей лёс закінуў паэта на Гродзеншчыну, дзе ён выкладваў рускую мову і літаратуру ў Поразаўскай спецшколе-інтэрнаце для слабых на зрок дзяцей, якая знаходзілася ў маляўнічых мясцінах на Свіслачы. Былі і Міншчына, і Гомельшчына, працаваў рабочым і будаўніком, выхавальнікам Пінскай школы-інтэрната для дзяцей-сірот, вартаўніком, карэспандэнтам раённых газет.

Першы верш Анатоля Шушко быў апублікаваны ў газеце «Піянер Беларусі» ў 1969 годзе.



Яшчэ школьнікам друкаваўся ў часопісе «Бярозка», газеце «Чырвоная змена». Пачаткам жа сапраўднага паэтычнага мастацтва сам Анатоль Іванавіч лічыць публікацыю падборкі вершаў у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».

Першыя, яшчэ са школьнай лаўкі, вершы пачынаючага паэта заўважыў і падтрымаў беларускі крытык Варлен Бечык: «Якой важнай і цікавай творчай заяўкай здаваліся вершы гэтага юнака! Былі ў іх і маладая ўсхваляванасць жыццём, і разважлівая дапытлівасць, і назіральнасць, і псіхалагічная чуйнасць. Праглядваліся даволі выразныя рысы асаблівасці, уласнага светаадчування».




Вершы Анатоля Шушко друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Нёман», «Беларуская думка», калектыўных паэтычных зборніках «На ладонях Припяти и Пины», «Маладыя галасы» (1985), «Галасы вёснаў» (1997), альманахах «Дзень паэзіі» (1991, 2005), «Люблю будзённы дзень» і ў расійскім альманаху «Москва» (у перакладзе В. Грышкаўца), а таксама ў цэнтральнай і мясцовай перыёдыцы. У 1994 годзе ў серыі “Бібліятэчка часопіса «Маладосць» пабачыла свет кніга А. Шушко з глыбокай філасофскай назвай «Выток і прычасце».




Анатоль Шушко стаў членам Саюза беларускіх пісьменнікаў у 1997 годзе. У 2006 годзе выйшаў з СБП і ўступіў у Саюз пісьменнікаў Беларусі.




У 2012 годзе выйшаў другі зборнік вершаў паэта «Шаны», за які ён атрымаў Дыплом ІІ ступені Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Лепшы твор 2012 года ў галіне паэзіі».

8 лістапада 2018 года Анатоль Іванавіч Шушко пайшоў з жыцця.












# Творчасць паэта



Ужо напачатку творчага шляху аўтар, разумеючы дыялектычную сутнасць чалавека – «ён свет дабра і злыбяды», – імкнецца знайсці сваю дарогу не толькі ў паўсядзённым жыцці, але і ў намаганнях мастака слова: «сцвярджаць сябе святлом дабра, бо ў жыцці так многа Двурушнасці, што дакараць рыхтуй сябе самога».

Высокая патрабавальнасць да сябе, да кожнага радка, кожнага слова ў паэтычнай страфе дазволілі ўжо сталаму майстру слова сцвердзіць думку, што *“ніхто не ўмее плакаць, як паэт. Ніхто, як ён, удзячна ўсміхацца”*. Можа, таму А.Шушко з асаблівай цеплынёй і любоўю згадвае ў сваіх вершах-прысвечаннях, прадмовах да зборнікаў землякоў-паэтаў. Яўгенія Янішчыц у гэтым мастакоўскім шэрагу стаіць асобна: першыя сур'ёзныя лімаўскія публікацыі пачынаючага паэта былі надрукаваны разам з вершамі “палескай ластаўкі”, з “зямлячкай-шчырунняй” ён меў творчыя стасункі, і адольваў філалагічныя навукі ў БДУ.




Праніклівым болем, шчырай горыччу незаменнай страты прасякнуты радкі верша “Землячцы”, прысвечанай Жэні Янішчыц:

*Жэня, нечаканымі хвілінамі*
*Б'е пад дых настылае быццё.*
*Ластаўка ж твая па-над чаінамі*
*У жыцця шукае пачуццё.*

Шмат вершаў А.Шушко прысвяціў сваёй малой радзіме, землякам, сярод якіх лірычная паэма “Сто шан для Сташан”, “О, Пінск”, “Тут”, “Пінску - юбіляру ад тутэйшага”, “Вячэрняму Пінску” і іншыя.

*Да ведама табе, радок мой шчыры:*
*Паўторны мы, як набываем вырай.*
*Тут - прызямляемся, ўзлятаем - там.*
*Агледзелі і саклю, і вігвам,*

*І вілу каля мора, ранча ў полі.*
*Няўрымсная душа, калі на волі*
*Імкнецца ў свет, каб новым напаяцца,*
*Каб ад прымусу смела вызваляцца.*

*Да ведама, радок! Нідзе ніколі,*
*Апроч Радзімы, не знайсці нам Долі!*

Творчасць Анатоля Шушко - шматвектарны накірунак: ёй уласцівы касмічная неабдымнасць і зямная канкрэтыка, філасофскія пошукі і шчырыя выяўленні чалавечых пачуццяў, зварот да мінуўшчыны і разважанні пра сучаснае жыццё. Паэт не абмінае ў сваёй мастацкай палітры пейзажных матываў Палесся і хвалюючых радкоў пра каханне. У выяўленні інтымных пачуццяў аўтар імкнецца перадаць самыя разнастайныя нюансы найвялікшага чалавечага шчасця: сумненні лірычнага героя ў нялёгкім выбары той адзінай, у студэнцкіх вершах “У блакнот” і “Яднанасць”, ці ўзвышэнне “святога кахання грэшнасці” у вершы “Манашка”, ці ціхае трымценне-захапленне “непрыкметным шчасцейкам”, аздобленае стылізацыяй народных песень, у вершы “На Купалле”. У больш позніх вершах на інтымную тэму аўтар прыходзіць да выстановы, што шчаслівым хвілінам кахання ён найперш абавязаны роднаму куточку:

Усёй сваёй творчасцю А.Шушко сцвярджае, што мастацкая шматмернасць, беражліва вынашаная паэтычнай годнасцю аўтарскага “я”, трывала грунтуецца на ўнутранай сіле акаляючага свету малой радзімы, якая робіць гэты свет жывым і дасканалым.

*Любоў, ты ёсць!*
*Дык будзь бясконцай,*
*Уратаваная Палессем.*

Ці, напрыклад, у вершы “Дыялог у Пінску” паэт параўноўвае ўнутраную прыгажосць, моц пачуццяў закаханых з хуткаплыннымі водамі Струменя і Піны:

*- З табою побач дзень*
*пры дні.*
*Няўжо табе*
*не надакучыў.*
*- Ты - Струмень,*
*што ў Піну ўнік,*
*А Прыпяці лагоду*
*лучыць.*
*- З табою разам дзень*
*пры дні.*
*А праганяць мяне*
*не станеш?*
*- Сплыліся плыні ў глыбіні,*
*Таму й расплесціся*
*не ў стане.*

# Шаны вам, Сташаны!

Віктар Гардзей

Назва кнігі выбраных вершаў “Шаны” таленавітага паэта Анатоля Шушко не выклікае пярэчанняў, хоць добра бачна, што гэты бліскучы наватвор не так ад слова “шанаваць”, як лагічнае пераасэнсаванне назвы вёскі Сташаны Пінскага раёна, дзе аўтар нарадзіўся ў 1954 годзе і, скончыўшы сярэднюю школу, а затым і філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, большую частку жыцця правёў у розных палескіх мясцінах. Працаваў рабочым і сельскім настаўнікам, выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры.

Зыходзячы з вызначанага для зборніка арыенціра, паэту ёсць што клапатліва засцерагаць, шанаваць, берагчы ад усялякага ліха, згрызот, напасці, і пра гэты, ці не галоўны, у ягонай творчасці арыенцір вельмі пераканаўча сведчыць верш “Сто шан для Сташан”. Па сваёй структуры і будове твор уяўляе ўсхваляваны трыпціх, бо складаецца менавіта з трох раздзелаў, а кожны раздзел пачынаецца рэфрэнам, або інакш – падзякай-шанаваннем:






*Сто шан табе, мой лан, мой кут*
*З папінамі ля хаты!*
*Дзе ж адпачну, калі не тут,*
*Як птушанё, крылаты.*

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Сто шан табе, сташанскі хлеб!*
*Стазыкая падзяка!*
*Ты і сягоння на стале*
*Ка мне не абыякі.*

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Сто шан і вам, браткі мае,*
*Палешукі-рупліўцы!*
*Хай усяго для Вас стае*
*І ў садку, й на ніўцы.*

“Сто шан” бацькоўскай зямлі, свайму народу, роднай мове Анатоль Шушко, валодаючы псіхалагічнай дакладнасцю і рэдкай паэтычнай назіральнасцю, выказвае эмацыянальна, вобразна, яркімі штрыхамі і малюнкамі, у якіх адразу ўгадваецца непаўторны палескі каларыт.



У свой час мне давялося быць укладальнікам і рэдактарам зборніка вершаў паэта, што выйшаў у папулярнай тады серыі “Бібліятэка часопіса “Маладосць”. Магу сказаць, што памяркоўны, і сціплы па натуры, уражлівы і вельмі шчыры беларус з палескай вёскі Сташаны настойліва шукаў, як шукае і цяпер, выток беларускіх крыніц роднай мовы, чалавечай дабрыні, а таксама “воблік неразгаданага шчасця ў неспатольнай шчодрасці прычасця”. Першую паэтычную кнігу ён так і назваў – “Выток і прычасце”. Два зусім розныя па семантыцы словы надзіва ўдала характарызуюць агульны напрамак і настрой чыстай, светлай, шчымліва-самотнай паэзіі Анатоля Шушко.

*Нашы дужыя продкі,*
*Прадзеды і дзяды,*
*Адкуль былі яны родам,*
*Дзе іх маленства сады?*

*Дзе іх выток бурлівы?*
*Што прывяло сюды? ...*
*“Сташаны – будзеш шчаслівы, –*
*Кажуць яны заўжды. –*

*Сташаны – сабе быць панам,*
*Панам жа ў вочы – хрэн.*
*Асветлены кут – Сташаны,*
*Як дуб векавы акрэп...”*

Жывапісную па малюнку і багатую на трапныя дэталі паэзію Анатоля Шушко, хоць і друкаваўся ён да крыўднага мала, не адзін раз згадвалі Уладзімір Калеснік, Алесь Марціновіч, Алесь Бельскі, а самыя першыя, яшчэ са школьнай лаўкі ягоныя вершы заўважыў і шчыра падтрымліваў у артыкуле “Набыццё вышыні” выдатны беларускі крытык і літаратуразнавец Варлен Бечык.

*Ніхто не ўмее плакаць, як паэт.*
*Ніхто, як ён, – удзячна пасміхацца.*
*Ніхто, як ён, пераўвасобіць свет,*
*Каб у адзінавечным памыляцца.*

# Сэрцу салодка, ясна, трывожна

Марыя Ляшук




Шчымліва-пяшчотная туга апаноўвае сэрца, калі перачытваеш вершы Анатоля Шушко, спатольваеш душу ягонымі цудоўнымі і неспадзёўку прыгожымі глыбока беларускімі словамі, вытканымі талентам сапраўднага Майстра высокага слова. Тужліва, што ўжо не папоўніцца яго паэтычная скарбонка новымі творамі-знаходкамі. Але і пакінутае самабытным аўтарам у спадчыну па-ранейшаму хвалюе і захапляе. Толькі сапраўды таленавіты чалавек можа так ёмка, усяго некалькімі штрыхамі выказаць сутнасць нашага быцця:

*Думныя каласы.*
*Ім расці, гусці.*
*Мне таксама трэба*
*па жыцці ісці.*

*Па-за краем неба*
*Вечнае – адно.*
*Праз наздрынку хлеба*
*Усё жыццё відно.*





Глыбіня мыслення і мудрасць. Яны - у кожным вершы Анатоля Шушко. Кожная думка, выказванне, дэталь прапушчаны праз ягонае сэрца.

Трэцюю па ліку, з вельмі сімвалічнай назвай “Сэрцу салодка, ясна, трывожна” кніжку выбранага пачаў складваць незадоўга да свайго сыходу. Складаў са сваёй “ясачкай”, любімаю жонкаю, вернаю спадарожніцай Любоўю Міхайлаўнай, якая годна і завяршыла намечанае да 65-годдзя з дня нараджэння паэта. Менавіта ёй прысвячаў ён сардэчныя пасланні-малітвы, прымеркаваныя да той ці іншай падзеі ў сумесным жыцці.

Чытайце, наталяйце свае душы яго прыгожым словам, бо радкі, напісаныя сэрцам, кранаюць да дрыжыкаў.

*Край крынічны – святочны.*
*Край зялёнага – весні.*
*Запарушаны вочы.*
*Загалошана песня.*

# Творы А.І. Шушко




**Ад сэрца**; Прызнанні палешука : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2005. 21 кастрычніка.

**Адзінаму**; Еўтэрпе; Пінскі снег; Перад настаннем дня : [вершы] / Анатоль Шушко // Дзень паэзіі-2005 / уклад. В.Шніп. - Мінск: Маст. літ., 2005. - С. 230-231.

**Апасля** сваркі; Настальгічнае; На сцежцы ў жыце; Вясна; З парога: [вершы] / Анатоль Шушко // Провинциалка. 2001. 23 августа.

**Беларусі**; На сцежцы ў жыце; Сум; Чараўніца : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 1999. 29 лютага.

**В родимой** белорусской стороне : [стихи] / Анатоль Шушко; пер. с бел. В. Гришковца // Нёман. 2005. №7. С. 79-80.

**Вас** не клікалі зоры?; Вясна; Чаму; Кім стаць хацеў?; Купалаўскае : [вершы] / Анатоль Шушко // Пинская неделя. 1998. 27 февраля.

**Вернасць** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2005. 12 ноября.

**Весні** матыў : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2005. 26 марта.

**Весні** матыў; Вясна; Майскаму ранку дома на ганку; Дзякую; Санет яднання : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2004. 22 кастрычніка.

**Віншаванка.** Дзве тысячы дзесятым! : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2009. 31 снежня.

**Вось** ён - напісаны верш!; Цішыня : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2005. 4 студзеня.

**Выток** і прычасце: вершы / Анатоль Шушко. - Мінск : Полымя, 1994. - 31 с.

**Вясеннія** паразуменні з Уладзімірам Караткевічам : трыпціх; Сват; На памяць; З татам : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2005. 24 чэрвеня.

**Вясновы** верлібр : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2000. 28 красавіка.

**Вячэрняму** Пінску; "Не хавай нашу папараць..."; "Святое неўзабаве застанецца..."; "Зноў ля помніка маці стаю"; "Пакрыёма праўда праяўляецца" : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2012. 17 жніўня (№33). С. 8.

**Гады.** Сыну Віталіку : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2008. 15 мая.

**Голас** кветак : [верш] / Анатоль Шушко // Белорусская нива. 2005. 19 апреля.

**Да** юбілею; Наступства сонечных промняў : [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2004. 14 августа.

**Да** юбілею; Мове; У дзень нараджэння; Наступства сонечных промняў; Навальніца : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2004. 17 июля.

**Думка**; Каханне; Сынам; Ідылічны накцюрн; Удзячнасць; Надзейнасць: [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2006. №11. С. 70-71.

**Да** бацькавага васьмідзесяцігоддзя. Да крэўнага франтавіка : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2006. 16 чэрвеня.
**Дыялог** ля роддома; Віншавальнае : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2003. 7 марта.
**З кнігі** лірыкі "Словы долі" : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 1998. №5. С. 98-103.
**"Знаёмая** мара паехаць у Брэст"; Кашулю шылі навырост : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2007. №11. С. 58-60.
**Золак** на волі; Дыялог з воляю; "Воно" : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2003. 19 снежня (№51-52). С. 8.
**Зямлячцы:** верш / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2013. 20 ноября. С. 6.
**Імгненнае**; Элегічнае; Радзімнае: [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2007. 18 октября.
**Камяні**; Пацеры да мовы; Каханне : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2011. №8. С. 46.
**Касьба** з водарам настальгіі : [верш] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2011. 22 красавіка.
**Касьба** з водарам настальгіі; Сум : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2005. 29 ноября.
**Каханы** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2003. 12 апреля.
**Майскаму** ранку дома на ганку; Шлях у чалавечнасць: [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2002. 8 мая.
**Маёй** Беларусі; Просьба да сонца; "Час родзіць паэтаў у нас"; Баладнае; Вершапад; След; Ушушканы ўспамінам; Кветка волі : [вершы] / Анатоль Шушко // Полымя. 2011. №11. С. 32-37.
**Маёй** Беларусі : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2007. 22 ноября.
**Малады**; Бацьку : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2000. 5 мая.
**Маналог** былога кінолага-пагранічніка Івана Бандарчука : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2000. 26 мая.
**Материнский** завет; Попытка гекзаметра; Валуны; Стошанам; На стежке в жите; «...Мой долг неоплатный...»; «...Зачем крічу под час отчаянно...» : [стихи] / Анатоль Шушко // Белой Вежи свет : сборник / сост. и пер. с бел. В. Гришковец. - Минск : ЛіМ, 2010. - С. 230-231.
**Метаморфоза** : [стихи] / Анатоль Шушко; пер. с бел. В. Гришковца // Нёман. 2007. №8. С. 57.
**Мова**; Замест "бывай!" ; Як зазірну ў сховішча душы…; Гудуць чмялі, спагадны бас ля хаты; Добры дзень! Родны ранак душы : [вершы] / Анатоль Шушко // Беларуская думка. 2000. №10. С. 165-167.
**Мяцеліца**; Снег; Іней : [вершы] / Анатоль Шушко // Раніца. 2001. 22 сакавіка.
**Навагодняя** застольная; Прызнанне; На прысвятак Ганны ў бацькоўскай хаце; **Дзеўне** з Беларусі; Да восені; Крынічка; Радасць : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2001. 29 декабря.

**Навізна** : [верш] / Анатоль Шушко // Народная газета. 2008. 21 лістапада.
**“Нядзіўна”** : Караткевічу : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2010. 18 декабря.
**Пацеры** да мовы : [вершы] / Анатоль Шушко // Белорусская нива. 2002. 12 декабря.
**Перад** настаннем дня; Навальніца; Георгію Андрэеву: [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2005. 27 мая.
**Пінская** бусліная балада : [верш] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2007. 11 мая. С. 8.
**Пінская** бусліная балада; Дыялог у Пінску; Да восені : [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2005. 25 октября.
**Пінскі** вальс : [песня] / словы Анатоля Шушко; музыка Алеся Жуковіча // Пінскі веснік. 2007. 5 кастрычніка.
**Пінскі** снег : [верш] / Анатоль Шушко // Белорусская нива. 2007. 6 февраля.
**Прачулае** і весняе : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2008. 14 февраля.
**Просьба** да сонца : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2002. 23 жніўня.
**Прывітальнае** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2004. 30 октября.
**Прызнанне** нашчадка; Бацькава песня : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2012. 4 мая (№18). С. 8.
**Прызнанне** нашчадка: Ветэранам Вялікай Айчыннай : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2005. 7 мая.
**Прыпамінальнае**; “Ніхто не ўмее плакаць, як паэт”; У блакнот; Хай жывуць студэнты!!!; Жартоўна-гумарыстычнае, сумесна суцяшальнае!; На купалле; Дыфірамб; На сцежцы ў жыце : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 16 ліпеня.
**Радзіме**: Просьба : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2007. 3 студзеня.
**Са святам!** : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 5 сакавіка.
**Сват** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2001. 3 мая.
**Свята** Перамогі : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2002. 8 мая.
**Семья** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2004. 7 февраля.
**Слова** долі; Перамога / Анатоль Шушко // Піншчына літаратурная : літ.-маст. зб. - Пінск : Пінскі веснік, 1999. - С. 68-70.
**Словы долі** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2003. 6 сентября.
**“Слязу** меў, бо жыць хацеў!..” або Нечаканы маналог таты : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 2 ліпеня.
**Сонейка** вясенняе маё; Хвілінку, шчасце, пачакай : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2004. 20 марта.
**Спатканне**; “Вось ён - напісаны верш!”; Выпускнікам горада Пінска : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 1 чэрвеня.
**Спешу** напиться звуками и словом… : [стихи] / Анатоль Шушко; пер. с бел. А.Аврутина // Нёман, 2010. №10. С. 100-101.
**Сташанам** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2004. 22 марта.

**Стошанам**; На стежке в жите; Попытка гекзаметра; Валуны : [стихи] / Анатоль Шушко; пер. В.Гришковца // Нёман. 2010. №6. С. 98-99.
**Сынавым** радком : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2006. 17 июня.
**Сэрцу салодка, ясна, трывожна** : зборнік вершаў / Анатоль Шушко. - Мінск : "Деловая печать". - 75 с.
**Сябру** : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 1999. 31 жніўня.
**Твой** самы; Мроя ў пінскім аўтобусе; Непаўторнасць; З парога : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2002. 20 верасня.
**Тень** вечности : [стихи] / Анатоль Шушко; пер. В.Гришковца // Нёман, 2000. №2. С. 155-156.
**Ты -** мой роздум аб шчасці; Бурштынавыя ночы; Любасці : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2013. 7 марта.
**Франтавік**; Дыялог : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2004. 2 июля.
**Франтавіку**, чалавекалюбу Зіновію Вагеру ахвярую : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2007. 16 кастрычніка.
**Халасцяк**; Графаман : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2006. 10 лістапада.
**Чараўніца** : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2011. 3 верасня.
**Чацвёрты** блок у сэрцы Стрыжака; Замаўляючы сабой бяседу; Распавёў ты сваё КОЛІСЬ сэрцам; Ды пра што я, Божа напрамілы?!; Міколу Цягелу; Мове; Дыялог сучаснікаў : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2001. №5. С. 27-31.
**Чмель:** [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2006. 18 красавіка.
**Шаны:** зборнік вершаў / Анатоль Шушко. - Мінск : Мінкапрынт, 2012. - 192 с.
**Шчырае**; На далонях вясны; "Прыгажосць выратуе свет" : [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2008. 31 июня.
**Услед**: Васілю Сахарчуку : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. 2003. 1 мая.
**Ушушканы** ўспамінам : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2005. 11 сакавіка.
**Ушушканы** ўспамінам; Мяцеліца : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2008. 24 января.

# Матэрыялы пра пісьменніка

**Алея** гарадоў-сталіц, “Баркулабаўскі летапіс” і …: [дыплом II ступені Рэспубліканскага конкурсу “Лепшы твор 2012 года ў галіне паэзіі” атрымаў у Быхаве А.Шушко] // Народная трыбуна. 2013. 6 верасня. С. 4.

**Бензярук, Р.** Ушукшаны Сташанамі / Расціслаў Бензярук // ЛіМ. 2012. 21 снежня. С. 10.

**Бензярук, Р.** Сто шан вам, Сташаны! Доўга, вельмі доўга Анатоль Шушко, таленавіты паэт з Пінска, чакаў сваёй другой кнігі / Расціслаў Бензярук // Народная трыбуна. 2012. 14 снежня.

**Бечык, В.** Будзем знаёмы : Анатоль Шушко / Варлен Бечык, Мікола Гіль // ЛіМ. 1971. 6 жніўня.

**Галубовіч, Л**. Свая адзнака : [рэц. на кнігу А. Шушко “Выток і прычасце”] / Леанід Галубовіч // Полымя. 1994. № 7. С. 254-256.

**Галубовіч, Л**. Сто шан! [Анатолю Шушко - 50] / Леанід Галубовіч // ЛіМ. 2004. 23 ліпеня. С. 5.

**Гарадніцкі, Я.** Паэзія-2011: зямное і ўзвышанае: [аб падборцы вершаў А.Шушко ў часопісе “Полымя”] / Яўген Гарадніцкі // Полымя. 2012. № 10. С. 179-180.

**Гардзей, В**. Паэты з вёскі Сташаны / Віктар Гардзей // Чырвоная змена. 1997. 27 мая.

**Гардзей, В**. Шаны вам, Сташаны / Віктар Гардзей : рэц. на кнігу “Шаны”. - Мінск: Мінкапрынт, 2012.

**Гришковец, В.** Анатолю Шушко - 50 / Валерий Гришковец // Полесская правда. 2004. 17 июля.

**Гришковец, В.** Мера жита - мера слова: жизнь! : [рец. на книгу стихов “Шаны” Анатолия Шушко] / В. Гришковец // Нёман. 2013. № 1. С. 208-211.

**Гришковец, В.** «Сто шан, паэт!» : [ о книгу стихов “Шаны” Анатолия Шушко] / В. Гришковец // Заря. 2013. 24 января. С. 19. // Полесская правда. 2013. 9 января. С. 3.

**Грышкавец, В.** Выток і прычасце / Валерый Грышкавец // Полесская правда. 1994. 1 октября // Пінскі веснік. 1994. 28 верасня.

**Грышкавец, В.** Слова пра Айчыну : [аб А. Шушко] / Валерый Грышкавец // Заря. 1993. 13 мая.

**Кантор, Д.** От народных криниц / Дмитрий Контор // Полесская правда. 2002. 8 мая.

**Кузьміч, П.** Вылучаны на рэспубліканскую прэмію : [Шушко Анатоль Іванавіч] / П. Кузьміч // ЛіМ. 2008. 25 студзеня. С. 22.

**Лаврович, Н.** Ни дня без поиска: юбилей / Николай Лаврович // Пінскі веснік. 2004. 16 ліпеня. С. 3.

**Локун, В.** Цэнтрам быційнай прасторы : [агляд твораў, у т. л. кнігі А.Шушко “Шаны”] / Валянціна Локун // Маладосць. 2013. № 10. С. 56-58.

**Ляшук, М.** Ляціць ягоны верш да небакраю / Марыя Ляшук // ЛіМ. 2014. 12 снежня (№49). С. 12.

**Макарэвіч, С.** Гучыць слова земляка над роднаю старонкаю: [сустрэча паэта А. Шушко з навучэнцамі Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта] / Святлана Макарэвіч // ЛіМ. 2012. 27 ліпеня (№ 10). С. 22.
**Маринчик, И.** Как ждут того, кто не обманет : встреча с поэтом А. Шушко / И. Маринчик // Полесская правда. 1998. 11 марта.
**Пададзены** заявы аб выхадзе з СПБ : [Анатоль Шушко] // ЛіМ. 2006. 10 сакавіка. С. 3.
**Папічыц, В.** Свята паэзіі і песні : [у в. Сташаны віталі сваіх землякоў-паэтаў М. Антаноўскага і А. Шушко] / В. Папічыц // Пінскі веснік. 1994. 22 чэрвеня.
**Патаранскі, С.** Паэт - ён нечаканасць… / Сяргей Патаранскі // Першацвет, 1995. № 5. С. 129-131.
**Приступа, Н.** Пятьдесят его дорог / Наталья Приступа // Пінскі веснік. 2004. 16 ліпеня. С. 3.
**Прыняты** ў Саюз пісьменнікаў : [Шушко Анатоль Іванавіч] // ЛіМ. 1997. 28 сакавіка. С. 4.
**Путь** в большую поэзию начался в Стошанах // Полесская правда. 1997. 15 февраля.
**Самуйлик, М.** Анатолия Шушко читают в Москве / М. Самуйлик // Полесская правда. 1998. 14 марта.
**Самуйлик, М.** Горит его звезда : [о творчестве А. Шушко] / М. Самуйлик // Пинская неделя. 1998. 27 февраля.
**Стрыгалёў, М.** Агмень паэзіі сапраўднай. "І маразы, і лета пах..." / Міхась Стрыгалёў // Маладосць. 1995. № 4. С. 251-252.
**Талкачоў, С**. Са сваім адчуваннем свету : [пра паэзію А. Шушко] / Сяргей Талкачоў // Пінскі веснік. 1997. 15 красавіка.
**Яцук, А.** Шаны Сташанам. І не толькі… / Алег Яцук // Полымя. 2013. № 3. С. 180-183.

“Гучыць слова земляка

над роднаю старонкаю”

**Анатоль Шушко**

**Рэдактар А.І.Анташук**
**Складальнік і камп'ютарная вёрстка К.Л.Міхалевіч**

*225710*
*г. Пінск, вул. ІПД, 35*
*тэл. 8 (0165) 32 23 66*
*e-mail: crbpinsk@tut.by*